Coordination Council

Information support – **info@rada.vision**
Press office – **press@rada.vision**
Telegram – **rada_vision**
Webpage – **www.rada.vision**

N20240710-196

Варшава

10.07.2024

**Заява Каардынацыйнай рады Беларусі «Аб асуджэнні злачыннага ракетнага ўдару па дзіцячай лякарні Охматдіт»**

Каардынацыйная рада Беларусі ад імя беларускага грамадства і дэмакратычных сілаў выказвае спачуванні блізкім загінулых, а таксама ўсім пацярпелым ад варварскіх ракетных нападаў з боку Расійскай Федэрацыі па мірных украінскіх гарадах, адным з самых чорных і злачынных прыкладаў якіх з'яўляецца ўдар па дзіцячай лякарні Охматдіт у Кіеве 8 ліпеня 2024 года.

Бальніца Охматдіт у Кіеве з'яўляецца ўнікальнай медыцынскай установай, якая займаецца лячэннем асабліва складаных захворванняў у дзяцей з усёй Украіны намаганнямі лепшых медыцынскіх спецыялістаў. Больш за 7000 тысяч найскладаных аперацый і сотні тысяч выратаваных дзіцячых жыццяў робяць лякарню Ахмадзіт найважнейшай гуманітарнай установай у перыяд агрэсіўнай вайны Расіі супраць народа Украіны.

Каардынацыйная рада Беларусі асуджае расійскую агрэсію супраць Украіны, мэтанакіраваныя забойствы мірных жыхароў Украіны, асабліва дзяцей, расійскімі войскамі, і заклікае Арганізацыю Аб'яднаных нацый, Міжнародныя арганізацыі і цывілізаваныя дзяржавы да расследавання гэтых актаў дзяржаўнага тэрору на прадмет наяўнасці ў іх прыкмет ваенных злачынстваў і злачынстваў супраць чалавечнасці Пуцінскага рэжыму.

Звяртаем увагу, што рэжым Лукашэнкі прымае саўдзел у агрэсіі супраць Украіны, што пацвярджаецца ў тым ліку інфармацыйнай падтрымкай наратываў расійскай

прапаганды і распаўсюджаннем ілжывай інфармацыі пра ўдар па дзіцячай лякарні «Охматдіт».

З улікам таго, што беларусы ў Беларусі не могуць зараз адкрыта выказацца супраць такіх дзеянняў рэжыму з-за палітычных рэпрэсій мы заклікаем беларусаў замежжа падтрымаць гэтую заяву, а таксама падтрымаць збор у падтрымку дзіцячай лякарні «Охматдіт».

**ПАСТАНОВА КААРДЫНАЦЫЙНАЙ РАДЫ БЕЛАРУСІ**

**9 ліпеня 2024 г.**

Аб заяве Каардынацыйнай рады Беларусі «Аб асуджэнні злачыннага ракетнага ўдара па дзіцячай лякарні Охматдіт»

Каардынацыйная рада Беларусі пастанаўляе:
1. Прыняць заяву «Аб асуджэнні злачыннага ракетнага ўдара па дзіцячай лякарні Охматдіт» (прыкладаецца).

2. Сакратарыяту Каардынацыйнай рады:
- апублікаваць дадзеную пастанову і заяву «Аб асуджэнні злачыннага ракетнага ўдара па дзіцячай лякарні «Охматдіт» на сайце Каардынацыйнай рады Беларусі;
- накіраваць дадзеную пастанову і заяву «Аб асуджэнні злачыннага ракетнага ўдара па дзіцячай лякарні Охматдіт» у адрас Генеральнага сакратарыята ААН, Міністэрства замежных спраў Украіны, міжфракцыйнага аб'яднання «За дэмакратычную Беларусь» Вярхоўнай Рады Украіны, сродкаў масавай інфармацыі Беларусі, Украіны і іншых краін;
- праінфармаваць Нараду фракцый аб выкананні даручэнняў, пазначаных у абзацах другім і трэцім дадзенага пункта, і атрыманых адказах.

3. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з моманту прыняцця.